НОВАЯ РУБРЫКА Ў ГАЗЕЦЕ: *ПІСЬМЫ З ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ*

БЕССМЯРОТНАСЦЬ

НАДВЯЧОРКАМ камандзір аднаго з палкоў Чырвонай Арміі палкоўнік Ермакоў атрымаў тэрміновы загад: адабраць групу воінаў для барацьбы ў тыле нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Першым дзяжурны выклікаў у штаб Пятра Галецкага. Палкоўнік не сумняваўся ў правільнасці свайго выбару. За два гады службы ў радах Чырвонай Арміі хлопец зарэкамендаваў сябе з самага лепшага боку. Сумленны, удумлівы і дзелавы салдат Галецкі ні на крок не адступаў ад воінскай прысягі, быў прыкладам для іншых у пашыраным армейскім жыцці.

Яны гутарылі больш як паўгадзіны. Палкоўнік пацікавіўся, адкуль родам Галецкі, чым займаўся да прызыву, хто застаўся дома.

...Нарадзіўся і вырас Пётр на Талачыншчыне, у ціхай і невялічкай вёсцы Майдан. Старанна вучыўся ў школе, марыў аб моры, аб далейшай вучобе.

У 1937 годзе 18-гадовага Пятра Галецкага сяляне выбралі брыгадзірам паляводчай брыгады.

У 1939-м яго прызвалі ў рады Чырвонай Арміі. З навакольных вёсак — Вялікай і Малой Ябланкі, Слаўнага — прыйшлі людзі праводзіць брыгадзіра на службу.

...Палкоўнік коратка растлумачыў абстаноўку. Радавы Галецкі ўважліва слухаў яго.

— Значыць, у «Перамогу»? — перапытаў воін.

Камандзір кіўнуў галавой.

Яны развіталіся. Ермакоў моцна, па-бацькоўску абняў салдата, тройчы пацалаваў. Любіў і паважаў ён, гэты сівы палкоўнік, смелых і знаходлівых байцоў.

Партызанскі атрад «Перамога», які быў створаны ў першы год вайны, дзейнічаў на тэрыторыі Смаленскай і Віцебскай абласцей. Для ўмацавання яго і была накіравана група кадравых афіцэраў і воінаў Чырвонай Арміі.

Налала зямля пад нагамі ворага. Ні днём, ні ноччу не давалі яму спакою народныя мсціўцы. Ляцелі пад адхон цягнікі з баявой тэхнікай і жывой сілай гітлераўцаў, гарэлі валасныя ўправы. На кожным кроку гітлераўскіх ваяк чакала смерць.

У многіх аперацыях прымаў удзел і Пётр Галецкі. Яму некалькі разоў аб'яўлялі падзяку перад строем, прадставілі да ўрадавай узнагароды.

У цёмную кастрычніцкую ноч 1942 года група падрыўнікоў з атрада «Перамога» павінна была выканаць адказнае баявое заданне...

Асцярожна рухаліся хлопцы-падрыўнікі ў напрамку чыгункі. Напярэдадні разведка атрада ўстанавіла, што з Віцебска на Смаленск будзе ісці варожы цягнік з ваенным грузам і цыстэрнамі з бензінам. Прапусціць яго было нельга.

Партызаны спыніліся ў сасонніку. Непадалёк, за некалькі дзесяткаў метраў, — чыгуначнае палатно, якое ўзмоцнена ахоўвалася. На вышках ворагі ўстанавілі кулямёты, праз кожныя 300—400 метраў — вартавыя. Мясцовасць да палатна чыгункі адкрытая, роўная.

Напасці на вартавых яны не маглі: сілы былі далёка не роўныя. Аднак цягнік трэба было падарваць.

Доўга раіліся падрыўнікі. Нарэшце, план быў складзены. Да палатна папаўзе Галецкі. Калі пакажацца цягнік, ён хуценька закладзе ўзрыўчатку...

Пётр узяў міну, паклаў у кішэню ўзрывальнік, папоўз да чыгункі.

Насып высокі, круты. Не так проста ўзабрацца на яго ды яшчэ з мінай. Але трэба. Калі да паравоза засталося якіх-небудзь 60—70 метраў, падхапіўся з зямлі і кінуўся на палатно. А цягнік усё бліжэй і бліжэй. І раптам магутны выбух страсянуў навакольле. Высока ў неба ўскінуўся вогненны слуп. З сасонніку сябры Пятра бачылі, як уздыбіўся паравоз, як ляцелі пад адхон цыстэрны з бензінам, вагоны са зброяй, абмундзіраваннем.

Скончылася жыццё адважнага сына Радзімы, пачалася яго бессмяротнасць.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 8 мая 1965 года за мужнасць і адвагу ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны Пятру Антонавічу Галецкаму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

А. МЯСНІКОЎ.

«Добры дзень, мае родныя!

...Пісаў вам часта і многа, так што дяпер і не ведаю, аб чым паведаміць. Аднак, мусіць, у далейшым пісьмы ад мяне будзеце атрымліваць радзей—вайна ж.

Вораг лепш узброены, ён напаў знянацку, і, вядома, на першым этапе перавага будзе на яго баку. Але гэта—часова. Перамога будзе за намі. Абавязкова будзе.

Вы не бойцеся за мяне, не перажывайце. Пакуль што ў адкрыты бой з ворагам наш полк не ўступаў, але кожны баец, кожны камандзір ірвецца на паядынак: наша маці-Радзіма ў небяспецы...

Палявая пошта, 30 чэрвеня 1941 года».

***

«Добры дзень, дарагія тата і мама!

Пішу вам з новага месца, з роднай Беларусі. Не ведаю, атрымаеце пісьмо ці не, але ўсё ж напішу...

Нам прадстаіць не менш работы, чым раней. Мы будзем агітаваць, узнімаць народ на барацьбу з люты ворагам. Дыверсійная работа, налёты на гарнізоны захопнікаў, збор даных пра ворага—усё гэта так важна і неабходна.

...Тры гады назад у гэты час мы збіралі ўраджай. Памятаеце, як радаваліся калгаснікі новаму хлебу?! А цяпер, мусіць, і збіраць няма чаго. Усё знішчаюць праклятыя фашысты. Але гэта ненадоўга. У нашай Радзімы дастаткова сіл і ўзбраення, каб перамагчы лютага ворага, вызваліць ад яго родныя гарады і вёскі. Я разам з некалькімі сябрамі атрымаў важнае і адказнае даручэнне. Перапраўляць пісьмы вам ужо не будзе магчымасці. А калі з'явіцца такая магчымасць — абавязкова напішу. Таму не турбуйцеся — усё будзе добра...*).

Верасень, 1942 год».

***

***) На жаль, гэты ліст бацька і маці П. Галецкага не атрымалі своечасова. Усю вайну захоўваў яго ў сваёй палявой сумцы камандзір партызанскага атрада «Перамога» Кірыла Іванавіч Новікаў. Адразу ж пасля сканчэння Вялікай Айчыннай вайны ён перадаў пісьмо бацьку героя — Антону Фёдаравічу Галецкаму. Пісьмо, напісанае за два тыдні да гераічнай гібелі Пятра...**